БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб.
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 19. Менск. Панядзелак 15 красавіка 1918 г. Год I

Менск 15/IV.

Рэвалюцыя далей ці творчасць?

Есьць модная словы «рэвалюцыянэр і контр-рэвалюцыянэр».

Першае слова усякі эурапэец зразумее. Рэвалюцыя гэта сбурэнне старого парадку, векамі трымаушаго народ на дзесяці ланцугах. Палітыка старого строю была у тым, каб ланцугі былі моцныя і народ трымаюць так, каб ен ні мог зразумець, што свабоднае жыцце выгадна народу, але нівыгадна вярхоунікам

Рэвалюцыя у быушай Імпэрыі парвала усе народныя путы, грамадзянскія свабоды засіялі над ад веку змучэннымі людзьмі.

Грамадзяне могуць ужо будаваць самі свае уласнае і дзержаунае жыцце. У Расіі палітычная рэвалюцыя дабілася усіх пажаданнеу, астаецца толькі сфарміраваць дзержаву с самым свабодным устройствам. Мы усе ужо добра ведаем. чым канчаецца сягодня найпякней нават пачатая рэвалюцыя у сьвеце. Пакуль яна рэгуліравалася дэмакратычнай расейскай інтэлігэнцыей, стаячай на грунце дзержаунасці, усе спадзевалися на добрую будучыну. Інтэлігэнцыя ужо даунo адкінута відзержаунай «вуліцай», «народам», і «Большэвізія» найшла капінца з гары у ніз у пропасць. Мала хто верыць, каб такі народ утрымау хаця грамадзянскія свабоды. Сацыяльная рэвалюцыя, абярнулася у дзікую анархію, каторая паламала усю эканамічную мэханіку Расіі у шчэнты Прадукцыйныя сілы краю зніштожаны падарваны, усіх чакае голад, «свабодны» пралетарыят пойдзе у чужыя староны на кабальную работу. абы толькі ні памерці з голаду.

Творчасць Беларусі.

Грамадзянство, дзержава есьць вельмі сбамплікаваны мэханізм, дзе інтэрэсы адных перэкрыжовываюцца с інтэрэсамі другіх групп супольства. У Расіі народ пачау сваімі рукамі рабіць, тое што кожнаму асобна найкарысней і найбліжэй; гэта кончыцца пагромам усіх высокіх рэвалюцыйных ідэяу.

У Расіі рэвалюцыя мужыцкая, там агромны кляс землеробоу-селян з нізкім эканамічнымі разуменнем, на верху вялікі слой памешчыкау, бюрократыі, капіталістоу. Сярэдняй і дробнай творчай буржуазіі вельмі малая праслойка, бо Расія старана эканамічна атсталая

Пабудаваць народную Рэспубліку з Вялікаросіі без такого балансіра, як сярэднія клясы мудрая штука. Можна толькі „углубляць» рэвалюцыю бо астанавіцца німа як німа на чым.

Акраіны быушай імпэрыі найбольш цярпелі ад самадзержавія, бо эканамічна яны больш разьвіты, хаця апека цэнтралізма і гамавала іх свабоднае эканамічнае развіцце. Гэта відаць з таго. што на Беларусь Літву. Лотву і Польшчу прыходзілося 68% усерасійскаго учету вэксляу. Сільны таргoвы абарот даводзіць, што дзіфэрэнцыацыя грамадзянства, і выдзеленне сярэдніх творчых слоеу было у Беларусі у поуным ходзе.

(Цікава, што на Украіну, палудзенныя губ. і Закауказье прыпадаець толькі 20% таргoвага абароту). Значыць творчыя сілы беларускаго краю вялікія. яны ні мелі толькі можнасьці шырока развівацца. Стварыць гэту магчымасьць можа толькі свой.

Дзержаўны мэханізм Беларусі.

Верхоуная уласць у Беларусі павінна быць дэмакратычная, дзержауныя слоі народу павінны быць крыніцай уласці, Першая работа наша будзе стварыць мэханізм дзержауны адпаведны нацыянальным, эканамічным і палітычным нашым варункам.

А перад гэтым трэба сабраць і знайсьці людзей да гэтаго годных.

С цяжкім возам на гнілой грэблі.

«Соцыялістычную» рэвалюцыю Беларусь спаткала німаючы моцнаго добра арганізаванаго меськаго пралетарыяту, з адным цёмным, забітым многавяковым гнётам з боку чужынцоў, сялянствам. Праўда селянство гэта данясло і да апошнято часу сваю пашану да закону, да прыватнай ўласнасьці, маець вялікую ніахвоту да чужынцоў. хціва прабіваецца да асьветы і разумее яе карысьць, але гэтыя добрыя прыкметы ні памаглі яму у патрэбны час. Надта асьцярожны, беларускі селянін ні схацеў сам забраць у свае рукі парадку, а дапусьціў да гэтаго «молодцов» с Тулы. якія услужліва узяліся пазбавіць яго ад усіх нішчасьцяў капіталізму, катораго Беларусь ішчэ ні перажывала.

Беларусь ні мела у гарадах і свайго «трэцяго стану» драбнейшыя слаі катораго ні астаўшыся з боку такога руху маглі-б надаць яму нацыянальны характэр, як то робілося у Расіі, дзе крамнікі і рамесьленікі абасноўывалі ідэёва с.-р. і большэвіцкі цэнтралізм. Адукаваныя вэрствы ні былі народнымі: шляхоцкая часьць будучы «польскай» пагарджала «хлопствам, яго баялась і ні любіла. а так званыя «разночынцы» дастаўляюшыя главным чынам працаўнікоў ва ўсякія урадовыя расійскія канцэляры[і] пропіталіся наскрозь другам расійскаго біорократызму і ні аказаліся здольнымі да творчасьці.

Нівялічкія сілы ішчэ маладой і да таго падпаўшай разгрому ў 1906—1908 годах беларускай соцыялістычнай партыі апыніліся у надта цяжкіх варунках. Прыйходзілася страшна напінаць голас каб скрозь многа-галосны шум соцыяльных лёзунгаў напомніць народу аб яго нацыянальна-культурных і палітычных патрэбах. Прыходзілася з бушаваўшаго Расійскаго мора ратаваць плаваўшыя ў ім беларускія аддзінкі і на іх закладаць грунт нацыянальнаго аб'еднання.

Тоя, што паўсюдах навокал іх чуліся варожыя галасы; тое, што правакацыя дэмагогаў цэнтралістау сыпалася аднакова і на соцыялістаў стварыўшых новы нацыянальны цэнтр замест коаліцыйнаго Нацыянальнаго Камітэту: тое, у канцы, што на гэту правакацыю лавіўся цёмны беларускі народ,—усё змушала беларускі соцыялістаў «ісьціў контакце» з рускай рэвалюцыяй. Кінуты рускай рэвалюцыяй лёзунг: «далоў коаліцыю» павінен быў прыняцца і імі, хаця беларускаму народу, як ніякому другому гэта коаліцыя была патрэбна дзеля слабасьці яго нацыянальных інтылігэнтных сілаў. Мы павінны прызнаць, што гэта быў адыны выхад для таго часу. Але як мала ён даў скуткаў! Замест стварэння моцнаго здольнаго да дзержаўна-арганізацыйнай працы цэнтру. тварыліся цэнтры на абраз і падобнасьць расійскіх «исполкомов», праўда лепшыя чым расійскія гаварыльні і пекарні рэзолюцыяў. бо пранятыя духам патрыотызму але слабыя і мала здольныя да працы.

Усё-ж ткі гэта былі цэнтры каля каторых зьбіралася беларуская сьвядомасць пачці стыхійна узрастаўшая у народзе і асабліва сярод войска. Іпапіханыя у перад па дарозе чыну беларускія цэнтры—Цэнтральная Рада, а потым Вялікая Рада, становіліся усё сьмялейшымі у сваіх дамаганнях перад Расійскімі урадамі і у сваіх арганізацыйных плянах. Поруч з стараннем стварыць ўласнае войско, з'явілася думка склікаць першы агульна-беларускі з'езд.

Ось тутака і выявілася трагічнасьць таго ўнутрэняго становішча ў якім знайходзіліся увесь час соцыялістычныя кіраўнікі беларускаго нацыянальнаго руху. Яны добра разумелі, што каб надаць такому з'езду характар нацыянальнаго конгрэсу, трэба, каб ён прэдстаўляў увесь народ з яго заможнымі і нізаможнымі станамі, а „контакт» з ходам падзеяў Расіі вымагаў, каб аб «буржуазіі» нават і спаміну ні было. Але на помач прыйшлі нізалежныя ад соцыялістаў прычыны . Як ведама, у Расіі ад пачатку рэвалюцыі саўсім ні стала палітычных партыяў правей к.-д. Ідэологі станавых інтарэсаў перасунуліся ў лева і занялі ні ўласьцівыя ім мейсцы, абыб хоць як бараніць справаў сваіх станаў. Беларусь ніколі ні ведаўшая арганізаванай абароны інтэрэсаў сваёй нацыянальнай буржуазіі, бо таковая як стан да беларушчыны ніколі і ні прызнавалася, аказалася у «лепшым» чым Расія становішчу,—яна ні мела партыяў і арганізацыяў якія-б сталі правей за народных соцыялістаў. А у земствах і гарадах гару узялі расійскія с.-р. якія у сваіх шарэнгах. асабліва на Беларусі, мелі нават быўшых члонкаў «союза истинно русскихъ людей» і «Архангела Михаила».

(Працяг будзе)

А. Н.

Агульныя весткі.

— Паводлуг урадоваго турэцкаго паведамлення ад 9/IV туркі на каўказскім фронце пры заняцці Вана узялі шмат аэропляноў, амуніцыі і харчовых запасоў. Турэцкае войско з удачным боем пасуваецца к Карсу.

— 9 красавіка Ллойд-Джордж рабіў даўно чаканае паведамленне у ніжней палаці аб сытуацыі на заходнім фронце. У канцу паведамлення Ллойд-Джорж абвесьціў прапазыцыі закону аб ваенных рэзэрвах. Па гэтаму закону здольнымі у войска маюць лічыцца людзі да 50 гадоў, а спэцыялісты да 55 гадоў. Агульная воінская павіннасьць маець быць пашырэна і на Ірляндзію, для каторай Урад запатрабуе ад парлямэнту ухвалы закона аб самапраўленні. Адчот Ірляндскаго конвэнта даець для гэтаго повад і надзею, што законы будуць прыняты добра. Ллойд-Джорж пэўны, што закон аб рэзэрвах

Абвестка.

1.

Ад 15 красавіка усе гандлёвыя крамы павіны зачыняцца у 7 гадзін пасьля поўдня; рэстарацыі і увесяліцельныя заклады усіх гатункаў, а так сама заклады злучоныя с рэстарацыямі у 11 гадзін вечару. Пасьля паказанаго часу у памянёных закладах могуць аставацца толькі іх ўласьнікі і іх родныя.

2.

У асобных выпадках рэстарацыі могуць быць адчыняны і пазьней паказанаго часу але на гэто павінно быць асобнае дазваленне. Мотываваныя просьбы павінны падавацца Нямецкаму Паліцэймэйстру—Койданаўская 28.

3.

У гандлёвых закладах, рэстарацыях і увяселіцельных закладах навінен быць вывешаным на відным мейсцу адзін экземпляр гэтаго распараджэння (можна атрымаць у Нямецкаго Паліцыймэстра). Пазваления атрыманыя на основе 2 пункта так сама павінны вывешывацца на відным мейсцу.

4.

Указы вайсковых і паліцэйскіх чыноўнікау павінны споуняцца. Госьці, якія адмовяцца даваць запатрэаованых ведамасьцяу, ці ні здолаюць прэдставіць патрэбных пасьвядчченяў будуць арыштоўвацца.

5.

Ніспоўнення карацімуцца грашовым штрафам да 3000 марок альбо пазбаўленнем вольнасьці да 6 месяцаў. Несколькіразовае ніспоўненне прыказу аб часе зачынення закладу павядзе за сабою яго закрыцце. Ніашчаднае ужыванне электрычнасьці можа пацягнуць за сабой адабранне току.

6.

Гэтае распараджэнне прыймае сілу ад 15 красавіка 1918 году.

Менск 14 красавіка 1918 г.

Камэндант **фон-Фракенберг. Палкоўнік.**

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 14 красавіка 1918 року.

ЗАХАД:

На полю бітвы па рацэ Ліс упартэй бітвой мы узялі мейсцовасьць поўднёвей Дув Баха. Войско генэрала Эбергардта прарвало пазыцыі непрыяцеля па поўдзень—заход Вульвергэма і пасьля зацятаго бою с ангельскім войском, шоўшым у контр-атакі занялі, Нэвэркерке. Атака войск генэрала Мэркекера дала нам спрамогу захапіць павышэнне заходней Орта. Бітва у Байэль ішла с пераменным шчасьцем. Вёскі Нэрріс і Вьебэркэн захоплены намі. Непрыяцельскія калоны высланыя на пляц бітвы шмат папярпелі ад нашаго агню, коррэктаванаго выведамі з зямлі і ў паветры і панясьлі вялікія страты.

На абаіх бакох Соммы артыллерыйскія баі. Атака нескольких французскіх батальёнаў каля Энвілер скончылася з ніўдачай для непрыяцеля. Мы узялі шмат палонных.

На поўнач ад Нігіэль мы зробілі удачны напад на аддзелы амэрыканскаго войска, учыніўшы для іх цяжкія страты і узяўшы палонных.

У паветрных боях у працягу апошніх двух дзён зьбіта 37 непрыяцельскіх самалётау і 3 прывязных балёны. Лейтэнат Венкгофен атрымаў сваю 24 пабеду.

С другіх тэатраў вайны нічога новаго.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар

фон-Людэндорф.

пройдзе без адцяжкі. Урад робіць гэта змушаны сытуацыяй, шкадуючы таго што робіць. Ллойд-Джорж закончыў. «Непрыяцель напаў на нас будучы на высаце сваёй сілы. Мы пакінуты адным сільным хаўрусьнікам, другі ішчэ ні гатоў кінуць на шалі дзесятай часьці сваёй моцы. Калі хочам выйсьці з вайны, каторая цягнулася-б гадамі, мусім цяпер выіграць бітву, а для гэтаго мусім пусьціць у ход усе нашыя сродкі».

Падобнае гэтаму паведамленне зрабіў у вышшай палаце лорд Кёрзон.

— Закон аб рэзэрвах у Англіі прыняты чытанием у ніжней палаці большасьцю 299 проціў 80. Агульнае зданне што закон пройдзе.

Весткі с Польшчы.

9 красавіка у ва усім каралеустве адбыліся выбары членау польскай Рады панства. Да гэтаго часу аб рэзультатах выбарау есьць такія ведамасьці: у Варшаве выбраны Ч. Бржэзінскі, Ал Россэт, Ф. Охімовскі,—ад Народоваго кола; Міх. Лэмпіцкі, Ст. Лібіцкі і А. Вейсблат ад кола цэнтру, ад VI курыі дзеля устрымання ад выбарау кола працы прайшоу п. Ноах Прылуцкі.

У Лодзі выбраны члены Меськай Рады р. Краецскі, інжэнэр, О. Кіндлер, Пабіяніцкі прамысловец і др. І. Розэнблат.

У Влоцлаве: Г. Радзішэвскі з Варшавы, А. Стржэлецкі з Юкова і Г. Пехомскі з Костуліна.

У Чэнстохове: дыр. акцыан. горн. т-ва у Гродцу Ст. Скарбінскі, гр. Вл. Патоцкі, др. Яз. Марчэускі.

Украінскія справы.

— Нота паданая старшынею Украінскаго кабінэту міністрау Каралеускаму ураду Румыніі гаворыць:

Гэтым гонар маю паведаміць, што кабінэт народных міністроу украінскай народнай рэспублікі уважае патрэбным асьведчыць каралеуска-румынскаму ураду сьледуючае: «Украінскі урад моцна заінтэрэсованы льосам Бэсарабіі, якая з'яуляецца гранічным краем Украінскай народнай рэспублікі. Насколькі мейсца населенныя абаімі пануючымі народамі: Украінцамі і Малдаванамі злучаны, то аднак ні можа выклікаць ніякога сумлення, што у поуначнай часьці Бэсарабіі жывуць пераважна Украінцы, каторыя у палудзеннай часьці, над берагам Чорнаго мора, паміж усьцямі Дняпра і Дунаю становяць большасьць. Таму па сваім этнографічным, эканамічным і палітычным варункам Бэссарабія з'яуляецца ніаддзялімай часьццю украінскай народнай рэспублікі.

Украінскі урад, пануючы над значнай часьццю Чарнаморскаго паберэжжа, на заходзе катораго знайходзіцца такі важны гандлевы пункт як Адэсса, с каторым зьвязана уся Бэсарабія, трымаецца таго пагляду, што зьмена дауней-шай рускай граніцы тутака і асабліва у поуначнай і палудзенай часьцях блізка датыча палітычных і эканамічных інтарэсау украінскай народнай рэспублікі.

Маючы на увазе, што цяпер значная часьц Бэссарабіі занята румынскім войскам і што пытанне аб далейшай належнасьці Бэссарабіі магло-бы быць разгледжэным на мірных перагаворах у Букарэшце, урад лічыць магчымым каб нарады над гэтым пытаннем, а так сама і рашэнне яго адбыліся толькі пры учасьці і згодзе дэлегатау украінскай народнай рэспублікі.

Падпісано: старшыня народных міністрау і міністр закордонных справау В. Голубовіч».

Весткі з Расіі.

Каміссарыят заграцічных справау у Маскве атрымау 9 г. м. радзіотэлеграму кямецкаго ураду у справе руска-украінскай згоды:

«На аснове 6 пункту мірнаго трактату расійскі урад прыняу абавязак зрабіць мір з Украінскай народнай рэспублікай у найкарочэйшым часе. Павэдлуг паведамлення украінскаго ураду, расійскі урад ні зрабіу нічога для таго, каб прыблізіць згоду ні гледзячы на пробы перагаворау з боку Украіны.

Судзячы што украінскі мірны трактат паміж іншым павінен развязаць усе пытання што адносяцца да граніц украінскай тэррыторыі, нямецкі урад спадзяецца што расійскі урад ніадкладна пачнець мірныя перагаворы з украінскай рэспублікай і просіць паведаміць яго аб пачатку гэтых перагаворау.

Міністэрство заграцічных справау. ф. д. БУШЭ.»

Камісарыят заграцічных справау адказау на гэта такім паведамленнем:

«У адказе на радзіотелеграмму нямецкаго міністерства заграцічных справау ад 5 г. м каторай нямецкі урад прыпамінае расійскаму ураду аб ніспоуненым ім абавязку пачаць мірныя перагаворы з украінскай Кіеускай Радай камісарыят заграцічных справау выкладае змест з сваей радзіотэлеграмы высланай 4 г. м. у Кіеу з прапазыцыяй пачаць перагаворы 6 г. м. у Смаленску.

Дзеля таго што ад Кіеускай Рады ішчэ да гетаго німа атказу, каміссарыят заграцічных справау просіць нямецкі урад паведаміць Украіну аб змесьце паказанай радзіотэлеграмы з новай датай.

„Petit Journal“ паведамляе, што у Петраградзі з прычыны галоднаго бунту уведзены стан аблогі.

— Пецербурская «Правда» з прычыны ні сьціхаючых чутак аб перамене нібыто курсу зауляе: «лезунгам Каммуністычнай Партыі астаецца як і раней пароль старога Вільгэльма Лібкнэхта — жадных уступак, жаднай згоды». Усе-змагаючы пралетарыят ні уступіць ні у якія згоды с кінутым ім у пыл становым непрыяцелям, ен будзе вясьці сваю барацьбу да поунай перамогі, да астатняго зьнішчэння капіталізму.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Прытулак для сірот-дзяцей на Захаураускай вул. у быушай школі для сьляпых, які нідауно перайшоу пад апеку Беларускаго Прэдстауніцтва,—32 дзяцей.

Заведуючая прытулкам мае вялікі клопат с прадуктамі, патрэбнымі для сірот. З вялікай труднасьці нідауна удалося крыху дастаць ад «Чырвонаго Крыжу» картофлі і саленай рыбы.

Нам вядомо, што для іншых прытулкау крыху лягчэй даюцца харчы. Хто ж тут гакі застауся і сядзіць ішчэ у Менску, што робіць перашкоды у беларускай працы?

— —

Картачкі на харчы немцы заводзяць ад 20-га красавіка. Апроч жалезнадарожнікау, бальніц і турмы—усе іншыя арганізацыі і усе жыхары нашаго места будуць атрымоуваць патрабнейшыя прадукты толькі па картачкам.

— —

Сягоння пасядзэнне Гарадзкой Думы; на чарадзе некольні вельмі важных і пільных спрау, якія усплылі за апошнія дні.

— —

Падгатовачныя курсы па ініцыатыве настаунікау духоунай сэмінарыі для падгатоукі да пераэкзаменовак ва усе школы, а так сама і для маючых пастуціць у сярэднія і ніжэйшыя вучылішчы аткрываюцца у пачатку мая. Плата 10—20 рубл.

— —

Канфэрэнцыя беларускаго прэдстауніцтва, якая назначана на 25-го красавіка, вызывае ажыуленне паміж праваслаунаго духавенства. Відаць, нашае беларускае духавенство добра зразумело, што настау рашучы мамэнт, калі яму прыдзецца прыняць на сябе вялікую, атветную працу у будауніцве Беларускай Дзержавы.

— —

«Юбілейный дом» (Захарауская) у хуткім часе пераходзе пад загад Беларускаго Прэдстауніцтва, дзе маюць быць злучаны шмат кульурных беларускіх арганізацый: лекцыі, бібліатэка, чытальня, склад выдауніцкі і інш.

— —

Агульная рэгістрацыя усіх жыхароу нашаго места мае быць назначана гэтымі днямі. Апрыч агульных фармальнасьцяу, павінны будуць прэдстауляны фатаграфныя патрэты, на като, ых нямецкая камэндатура будзе ставіць свае печаткі.

— —

Падрад на хлеб—выпекаць 2000 п. у дзень—нямецкае начальство здало Канторовічу і Фрыдлянду. Хлеба будзе выдавацца па 1/2 фунта на душу.

— —

На работы у Нямеччыну запісалося 35.000 душ. Праз тыдзень запісь мае ужо скончыцца.

— —

У казначэйстве у мінулую суботу 13-го красавіка быу зробляны падлік усіх зямельных налогау, прамысловых зборау і іншых даходау, якія пастуцілі у казну за апошнія два тыдні т. е. ад таго часу, ак казначэйство пачало сваю працу,—і паказалося, што усяго собрано 55.000 рубл., а тымчасам служачым казначэйства: скароовай палаты за красавік аднэй пэнсыі належыць 25.000 рублеу.

— —

Апошні украінскі эшалон адыйшоу учора 14 красавіка, у 2-ой гадзіне дня. Эшалон гэты складауся с цывільных асоб і астаушайся часткі вайсковых.

Першыя некалькі дзен, пачынаючы с 14-го красавіка, будзе вольны выязд для усіх вайсковых украінцау; застаушыяся пасьля гэтаго без работы украінцы будуць высылацца на рауні з іншымі.

— —

Губэрнскае Земство, прыняушае пад сваю апеку прытулкі для дзяцей, мае з іх сфармаваць сельско-гаспадарскія каленіі, якія займуцца палевай гасцадаркай і агародніцтвам, для чаго губ. земство шукае у блізкасьці Менска заарэндаваць зямлю.

Запрапанаваны членом губ. прысутства Шчэпот'евым фольварк «Цна» за 3000 рублеу за 100 дзесяцціны—земство не найшло выгодным для сябе.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблята